УДК 821.161.3

***Ірына Аляксандраўна Воран***
*канд. філал. навук, дац. каф. рускай літаратуры і журналістыкі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Iryna Voran***
*Candidate of Philological Sciences, Docent of the Department of Russian Literature and Journalism*
*of the Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: voron-irina@mail.ru

# АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАГА АКРАСАНЕТА Ў СУЧАСНАЙ ПАЭЗІІ

*Разглядаюцца асаблівасці развіцця акраверша ў сучаснай беларускай паэзіі, вылучаецца тэндэнцыя да стварэння сінтэтычных вершаваных форм, якія аб'ядноўваюць розныя фарматворчыя стратэгіі. Вынікам такой эксперыментальнай трансфармацыі стаў акрасанет. Асэнсоўваецца праблемна-тэматычны дыяпазон і мастацка-эстэтычныя, фармальныя характарыстыкі сучасных акрасанетаў.*
***Ключавыя словы:*** *санет, акраверш, беларуская паэзія, акрасанет, сучасная паэзія.*

## The Features of the Belarusian Akrosonet in Modern Poetry

*The article examines the peculiarities of the development of acrosticism in the contemporary Belarusian poetry, the tendency to create synthetic poetic forms that combine various form-making strategies is highlighted. The result of this experimental transformation was the acrosonet. The author comprehends the problem-thematic range, and the artistic, aesthetic, formal characteristics of modern acrosonets.*
***Key words:*** *sonnet, acrostic, belarusian poetry, akrosonet, modern poetry.*

### Уводзіны

Сучасная беларуская паэзія вызначаецца свядомым імкненнем творцаў да эксперыменту, пошуку новых форм і сродкаў мастацкага спасціжэння рэчаіснасці – схільнасці да іншасказання, сімвалічнасці, шматсэнсоўнасці, складанай асацыятыўнасці твораў. Ускладненне паэтыкі вершаваных твораў абумоўлена шэрагам прычын эстэтычнага, філасофскага і светапогляднага парадку, намаганнем паэтаў адлюстраваць тыя няпростыя працэсы, якія акаляюць сучаснага чалавека, вызначыць экзістэнцыйныя матывы яго існавання і тыя звышпатэнцыі, што дапамаюць балансаваць на мяжы духоўнага вакуума і прагі пераадолення гэтай пустаты, пераадолення хаосу і перастварэння яго ў космас. Пошукі балансу, гармоніі вызначаюць логіку развіцця айчыннай паэзіі канца XX – пачатку XXI стагоддзя.

А. Бельскі вылучае дзве асноўныя плыні ў развіцці сучаснай беларускай паэзіі – «неакласічную, якая трымаецца на традыцыйнай сістэме каштоўнасцей (нацыянальна-культурных, духоўных, эстэтычных), якая… скіравана на выкарыстанне і абнаўленне класічнай паэтыкі, і авангардную (постмадэрнісцкую) – фармальна-кампазіцыйную, тэхнічна-камбінаторную, у многім эклектычную і хаатычную вершаваную творчасць» [5, с. 37]. Відавочна, што гэта рознаскіраваныя тэндэнцыі, у аснову якіх пакладзены супрацьлеглыя вектары развіцця паэзіі – традыцыяналісцкі і эксперыментальны, але сучасная паэзія ўсё болей выяўляе тэндэнцыю да сінтэзацыі гэтых канцэптуальна розных паэтычных стратэгій, і збліжэнне іх мае сваё лагічнае тлумачэнне.

### Сінтэтычныя мадыфікацыі акраверша ў сучаснай беларускай паэзіі

Эксперыментальную тэндэнцыю ў сучаснай паэзіі складаюць вершаваныя формы гэтак званай «камбінаторнай» паэзіі (акравершы, паліндромы, анаграмы і інш.). Гэты тэрмін ўведзены ва ўжытак французкімі паэтамі і выкарыстоўваецца ў беларускім літаратуразнаўстве В. Жыбулем. «Камбінаторная» паэзія заснавана на матэматычным прынцыпе перастаноўкі элементаў тэксту, пошуку розных варыянтаў раскадзіравання тэксту. Падобныя вершы вызначаюцца, з аднаго боку, выразнай гульнёвай канцэпцыяй, стварэннем візуальных эфектаў-падтэкстаў, а з іншага – строгім следаваннем неабходным правілам пабудовы гэтых форм, што ў пэўным сэнсе аб'ядноўвае іх з канцэпцыяй класічных цвёрдых вершаваных форм – санета, трыялета, актавы і інш.

Акраверш – гэта адметная вершаваная форма, разлічаная «на зрокавае ўспрыманне верша, у якім пачатковыя літары вершаваных радкоў, прачытаныя зверху ўніз, утвараюць якое-небудзь слова: прозвішча або імя паэта, ці таго, каму верш адрасуецца, нейкае прызнанне, пажаданне, адказ на пастаўленае пытанне і г. д.» [11, с. 439]. Першыя літары кожнага радка выбудоўваюць дадатковы вертыкальны радок, які можна прачытаць толькі ў напісаным або надрукаваным выглядзе. Акраверш як разнавіднасць паэтычнай формы бярэ свае вытокі з магічных тэкстаў з часоў эпохі Антычнасці, але пазней страціў сваю магічную функцыю, транфармуючысь у лірычны тайнапіс. Так, у акравершах-прысвячэннях у вертыкальным радку зашыфроўваецца імя таго, пра каго (або каму) напісаны твор. Сучасны тайнапіс акраверша дазваляе паэту смела ствараць метафарычныя, складаныя, завуаляваныя вобразы, даючы ключ да іх разгадкі ў вертыкалі твора. Сёння гэта своеасаблівая літаратурна-фармальная і моўная гульня, якая дэманструе майстэрства валодання мовай і паэтычнай тэхнікай паэтам, а таксама спосаб ствараць дадатковую візуальную і філасофскую прастору верша, своеасаблівы сэнсавы фокус твора.

Беларускай літаратуры акраверш вядомы ад часоў Асветніцтва, дзякуючы творчасці Ф. Скарыны, але сапраўднага пашырэння ён набыўу паэзіі другой паловы XX ст. У 1960–70-я гг. Р. Крушына ўвёў форму акраверша ў беларускую літаратуру як узоры вытанчанай паэтычнай формы нароўні з санетам і трыялетам. Згодна тэматычнай скіраванасці В. Жыбуль вылучыў некалькі груп акравершаў: вершы-прысвячэнні, вершы-загадкі, азбукоўнікі, складакравершы, мезавершы і тэлевершы. Сёння акравершы належаць як вядомым паэтам (Н. Гілевічу, А. Сысу, У. Дубоўцы, В. Жуковічу, В. Дэбішу і інш.), так і паэтам-пачаткоўцам.

У апошнія гады свайго жыцця вялікую колькасць акравершаў стварыў Р. Барадулін, арыгінальна вызначаючы іх у адпаведнасці з мэтай напісання ці зместам твору – «Акраподумка», «Акрадзякуй», «Акразычанне (Сяргею Панізніку)», «Акравітанне», «Акраверш з нагоды», «Акрачалом праз акіян», «Акраліст», «Акранавагодняе», «Акравясновіца», «Акрашана», «Акраздзіў», «Акрагуканне», «Акрааўтограф» і «Акрамроя», якія датуюцца 2012–14 гг. Найбольш пранікнёныя вершы паэта прысвечаны маме («Акраўдзяка»):

***М****рояй маладых праведны ды**м***
***А****дцяняе боскі профіль храм**а**.*
***М****оліцца нябёсам пілігры**м**,*
***А** над ім сьвятая зорка **Мама**...*[3, с. 58]

Р. Барадулін у чатырох радках максімальна выкарыстоўвае тайнапіс акратэлевершу, дзе апошнія літары кожнага радка паўтараюць камбінацыю пачатковых літар верша, каб сакралізаваць вобраз мамы, якая ўвасабляе сабой усю шчырасць, святло і дабрыню, якія ён спазнаў у жыцці і намагаўся захаваць як абярэг душы і чалавечнасці. І нават фармальныя абмежаванні гэтага верша не сталі перашкодай для паэтызацыі яе вобразу, а канцэптуальна падкрэслілі залежнасць паэтычнага сусвету Барадуліна ад мамы.

Цікавую форму акраверша Р. Барадулін падае і ў «Спробе акраверша», якая характарызуецца яшчэ большай фармальнай ускладненасцю, калі паэтычны тэкст спалучае рысы акраверша і мезаверша – твору, дзе пэўнае слова ці выраз утвараюцца адпаведна сярэднімі і апошнімі літарамі вершаваных радкоў:

***Але****ню здзіўлення аб ск**алы** адчаю разбіцца ў зап**але**.*
***Л****едзь Вашая ўсмешка ўзыдзе – ўхв**ал** загрыміць абв**ал**.*
***Але**, **а**сма**ле**ўшы ад страху, вывоаджу світ**альнае***
***Але*** [7]

Сам Р. Барадулін прызнаўся ў сваім інтэрв'ю, што апошнім часам выяўляў большую прыхільнасць да эксперыментальных малых вершаваных форм, да гэтак званых «настраёвых іскрынак», альбо «ахвярынак» (як сам вызначаў жанр гэтых твораў аўтар), а таксама да мініяцюрных акравершаў, якім бракуе «манументалізму». Але і ў гэтай «нешматслоўнай» форме паэт застаецца ўдумліва-глыбокім і пранізліва-мудрым. Гэтыя творы нагадваюць мікрапаэмы-рэфлексіі пра сучаснае і мінулае, часовае і вечнае, сапраўднае і ілюзорнае, каштоўнае і нікчэмнае, хуткаплыннае і неўміручае.

Напрыканцы XX ст. у беларускай літаратуры назіраюцца цікавыя мадыфікацыі акраверша, якія ўзнікаюць у выніку яго сім-

біёзу з іншымі жанравымі формамі. Т. Баркоўская адзначае «імкненьне сінтэзаваць разнастайныя паэтычныя жанры ў адным вершы» [3, с. 18] як выразную тэндэнцыю ў развіцці сучаснай паэзіі канца ХХ ст. У выніку такога сінтэзу з'яўляюцца новыя формы – «Акрамадрыгал» Р. Барадуліна, «Акраіронія» Ю. Свіркі, «Акрагекзаметры» А. Трафімчыка, акраверш «Канцона» У. Клішэвіча, «Акраэлегія» Т. Барысюк і інш. Даследчык рускай літаратуры Сяргей Бірукоў тлумачыць з'яўленне сінтэзаваных форм тым, што «акраверш у тым выглядзе, у якім ён дасюль існаваў, сябе вычарпаў» [6, с. 33]. Спалучэнне класічных цвёрдых вершаваных форм і акраверша становіцца сведчаннем развіцця сучаснай паэзіі ў напрамку фармальнай ускладненасці, якая не толькі дэманструе версіфікацыйнае майстэрства паэтаў, але сведчыць пра пошукі новых драматычных, алегарычных спосабаў мастацкага самавыяўлення.

**Акрасанет як выяўленне версіфікацыйнага майстэрства беларускіх паэтаў**

Найбольш цікавай і складанай у выкананні сярод сінтэтычных форм у сучаснай беларускай паэзіі стаў акрасанет. Санет, як вядома, сфарміраваўся ў сусветнай літаратуры на мяжы Сярэднявечча і Адраджэння і стаў шырока вядомай цвёрдай паэтычнай формай у еўрапейскай літаратуры і за яе межамі. Да гэтай формы прад'яўляецца шэраг патрабаванняў: чатырнаццаць радкоў санета павінны аб'яднаноўвацца ў два катрэны і два тэрцэты з адметнай рыфмоўкай, якія, у сваю чаргу, заклікаканы своеасабліва разгортваць яго паэтычную думку (згодна мадэлі «тэзіс – антытэзіс – сінтэз»). Гэтую драматургічную асаблівасць класічнай формы падкрэсліваў М. Багдановіч у артыкуле «Санет» (1911), адзначаючы, што асаблівая нагрузка падае на апошні радок тэрцэта («санетны замок») – найбольш моцнае месца ў санеце, а апошняе слова ў ім павінна быць своеасаблівым сэнсавым «ключом» да ўсяго твора. Строгія патрабаванні, вызначаныя у правілах і абмежаваннях будовы гэтай формы (аб'ёме верша, схеме рыфмаграмы, вершаваным памеры, якасцях рыфмы), надзяляюць яго пэўнымі камбінаторнымі якасцямі. Так, І. Бехер у трактаце «Філасофія санета, або Маленькі наказ па санету» (кніга «Паэтычны прынцып», 1957 г.), таксама вызначае «канструктарскую» прыроду творчасці санетыста, якая становіцца своеасаблівай «правакацыяй» для паэта, выклікам яго паэтычнаму майстэрству і пэўнай праверкай тэхнічнай дакладнасці, эстэтычнага адчування гэтай элегантнай формы творцай.

Акрасанет спалучае дзве фармальна абмежаваныя паэтычныя стратэгіі. Далучэнне да складанай у выкананні санетнай формы новых камбінаторных магчымасцей тэксту, рэалізаваных у візуалізацыі яго дадатковых сэнсаў (як таго патрабуе форма акраверша) у значнай ступені садзейнічае дысцыплінаванню паэтычнага маўлення і патрабуе яшчэ больш высокага ўзроўню паэтычнай тэхнікі ад творцы. Гэтая форма зацікавіла і Р. Барадуліна, надзвычай адкрытага да падобных "эстэтычных правакацый". Паэт здолеў аб'яднаць два архітэктанічныя малюнкі ў адзіным вершы («Акрасанет», 1980), стварыўшы санет-прысвячэнне з ідэальна вытрыманай класічнай італьянскай рыфмаграмай (ababababccdcdc), чатырнаццаць радкоў якога з пачатковых літар складваюцца ў імя і прозвішча таго, хто натхніў яго на напісанне гэтага твора (Мікалаю Казлову):

***М****ой шчыры край цябе прызнаў за сына,*
***І*** *родным стаў для сэрца валгара.*
***К****алі ў бары прымаецца ляшчына,*
***А****тожылку купчасціцца пара.*
***Л****учае нашы дні павагі ліна,*
***А****шчаднасці асенняя пара.*
***Ю****начых мар не глухне каляіна,*
***К****іруе думку клопатаў быстра.*
***А****д нас гады спяшаюцца імкліва.*
***З****ярняты веры не пусці на мліва.*
***Л****ямеш світае святам плугара.*
***О****д не чакае, колас хваліць ніва.*
***В****яртаецца вякам вачэй зара –*
***У*** *сыне паўтарыўся ты шчасліва.* [2, с. 7]

Р. Барадулін дэманструе віртуознае валоданне санетнай тэхнікай, паслядоўна выбудоўваючы драматургію акрасанета: тэзіс пра «валгара», які стаў сынам для «новай радзімы», пра пачатак новага жыцця перарываецца антытэзісам пра хуткаплыннасць жыцця, юнацтва і жаданне зберагчы юначы запал, пасля чаго назіраецца сінтэз (або «кампраміс» думкі), дзе аўтар вымаўляе ідэю цыклічнасці, «бясконцасці» жыц-

ця, увасобленай у сыне як арганічным працягу самога Мікалая Казлова.

У вершы назіраецца адно адступленне ад патрабаванняў санета: паэт дапускае паўтарэнне аднаго слова «сын» ў першым і апошнім радку, якое, на нашу думку, было зроблена свядома. Р. Барадулін такім чынам падкрэсліў «шчаслівую» долю паэта і чалавека быць прызнаным «сынам» свайго краю і «паўтарыцца» ў сваім сыне, перадаўшы ў спадчыну талент, творчы вектар развіцця асабістасці. Паэт нібы “закальцоўвае” гэтым словам ідэю вечнасці творчасці, паўтаральнасці як жыццясцвярджальнага стрыжня жыцця.

Прыкладам грамадзянскай лірыкі стаў «Акрасанет» (1999) з аўтапрысвячэннем Івана Лагвіновіча (зборнік «Ляда юдолі»), у якой выразна прадстаўлена грамадска-палітычная і нацыянальная пазіцыі паэта, яго бачанне гісторыі і долі народа:

***І** да мяне наведваецца Муза,*
***В**ыводзіць з меланхоліі душу.*
***А**панаваны роздумам, пішу*
***Н**атхнёны верш пра долю беларуса.*
***Л**аўлю былых гадоў, стагоддзяў шум,*
***А**дкопваю засыпанае друзам.*
***Г**ратэскавых імперый і саюзаў*
***В**яду разбор, маральны суд вяршу.*
***І**дыліям лагоднага жыцця*
***Н**е шмат адмерана ў мінулым часе.*
***О** мой народ! Дапі цярпення чашу,*
***В**азьмі свой меч зазубраны і сцяг,*
***І** шчыт вазьмі з выявай Пагоні —*
***Ч**акаюць змагароў за волю коні!* [10, с. 7]

Паэт вытрымлівае драматургію санета: выказваючы намер пад уплывам Музы напісаць «натхнёны верш пра долю беларуса» (тэзіс), але паэт з горыччу адзначае нялёгкі гістарычны шлях сваіх суайчыннікаў (антытэзіс), заклікаючы народ да барацьбы «за волю» (сінтэз). Рыфмаграма дадзенага разняволенага акрасанета парушае вядомы французскі канон «апаясанай» рыфмы ў другім катрэне і перанос рыфмы з другога катрэна ў першы тэрцэт (abba **baab** cc**b** cdd), што ўносіць дысананс у строгую гармонію формы і перадае эмацыянальны надрыў паэта ад нацыянальнай нерэалізаванасці, гістарычных страт народа ад «гратэскавых імперый і саюзаў», дзяржаўнай недавызначанасці і страты гармоніі, ілюзорнасці «ідыліі лагоднага жыцця» беларуса і нежаданне аўтара з гэтым нацыянальным і чалавечым сцэнарыем мірыцца.

У інтымнай лірыцы акравершы выкарыстоўваюцца паэтамі для прызнання ў сваіх пачуццях, таму вертыкальны радок звычайна складваецца ў імя каханай. Гэта дае нам падставы вылучыць разам з акрасанетамі-прысвячэннямі акрасанет-прызнанне. Клепікаў Ігар падае цікавы прыклад інтымнага разняволенага акрасанета-прызнання, у якім двойчы зашыфроўвае імя адрасата: па-першае, традыцыйна для гэтай формы па вертыкалі, а па-другое – па гарызанталі ў загалоўку твора («АКраСАНЕт»), што надае акравершу дадатковых камбінаторных якасцяў і яшчэ больш выразна акцэнтуе ўвагу на асобе каханай:

***А**колькізоракзгасла ў вышыні,*
***К**алісвятлоіхзасланіўраптоўныпозірк.*
***С**ышлі ў барозныйсіняераллі...*
***А**ле ягосвятла мне будзедосыць*

***Н**ачной парой, калістаіць туман,*
***А**хутаўшыдарогі, дрэвы, хаты...*
***А**ле мне цёпла... Толькі той шаман*
***Х**ай не клянецца, што не вінаваты.*

***А**затуманамжабкіцягнуць ноты,*
***К**агосьціпазбаўляючысамоты,*
***С**пакойтакіжаданыдаючы.*
***А**ле паэтамноччунеспакойна –*
***Н**е спіццаім, як дыхаеццавольна.*
***А**дкрыйцедзверы, выкіньцеключы* [8].

Драматургія акрасанета пабудавана на паўтарэнні мадэлі «тэзіс – антытэзіс» у кожным з катрэнаў і ў тэрцэтах, узмоцненая паўтарэннем злучніка «але», што згушчае драматызм і перадае дынамічнасць унутранага свету лірычнага героя, яго пачуццяў. У тэрцэтах паэт выкарыстоўвае антытэзу «спакой – неспакой», якая падкрэслівае нестабільны эмацыйны стан закаханага, узбуджанасць і напружаную пульсацыю яго нерваў. Характэрнай асаблівасцю гэтага акрасанета стала яго свабодная рыфмаграма, блізкая да «шэкспіраўскага санета» (ababcdcdefefgg). Але аўтар адыходзіць ад паслядоўнасці англійскай рыфмаграмы ў тэрцэтах (abab cdcd eef ggf).

Анатолю Трафімчыку таксама належыць узор любоўнага акрасанета-прызнання «Магчыма я ня меў ніколі рацыі…» з вытанчанай і найбольш гарманічнай санетнай рыфмаграмай французскага ўзору –

abbaabbacddccd – і зашыфраваным адрасатам-сімпатыяй у вертыкальным радку («мілая мая Ірачка»):

*__М__агчыма, я ня меў ніколі рацыі,*
*__І__ Боскай воляй ісьціна цяпер*
*__Л__яжыць ня ў аркушах маіх папер,*
*__А__ ў вуснах мілае дзяўчынкі-грацыі.*
*__Я__шчэ далёка да рэінкарнацыі.*
*__М__астак, аднак, зямных ды іншых сфэр*
*__А__дкрыў цябе – нібыта напавер, –*
*__Я__ ж не магу пакінуць меж прастрацыі…*

*__І__ch liebe dich! To be or not to be?!*
*__Р__асьце, расьце ўсё ж горыч у грудзёх,*
*__А__ле – я не магу, як і ня мог.*

*__Ч__аму? – Ня ведаю. Любі ці бі,*
*__К__алі заўгодна, то што хоч рабі:*
*__А__статні шанец — гэта ты і Бог!* [8]

Гармонія строгай формы санета дазваляе аўтару надзвычай пранікнёна прызнацца ў сваіх пачуццях і драматычна выдыхнуць у «санетным замку» важныя словы: «астатні шанец – гэта ты і Бог!». Як вядома, найбольш моцнае месца ў санеце – гэта апошняе слова, якое з’яўляецца ключом да ўсяго твора, найперш да разумення паэтам сутнасці кахання як Божага дару, «Боскай волі», адкрытай паэту «ісьціны», якая ўяўляецца закаханаму астатнім шанцам на ратаванне ў роспачным і разгубленым стане.

З’яўляюцца ў сучаснай беларускай літаратуры і цалкам адметныя варыяцыі спалучэння акраверша і санета: Эдуарду Акуліну належыць акрапаэма «Шлях да Радзімы», якая ўяўляе сабою вянок санетаў. Кожны з чатырнаццаці санетаў вянка пачынаецца адпаведным па парадку радком з вядомага санета М. Багдановіча «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі», які ўзнаўляецца ў магістральным санеце творцы.

**Заключэнне**

Такім чынам, у сучаснай беларускай паэзіі назіраецца тэндэнцыя да эксперыментальных фармальных пошукаў, якая выявілася ў з’яўленні шматлікіх сінтэтычных мадыфікацый даўно вядомых еўрапейскіх вершаваных форм. З канца ХХ ст. наздвычай папулярнай стала форма акраверша, якая ўступае ў сімбіёз з формай санета, што таксама сведчыць, з аднаго боку, пра развіццё сучаснай паэзіі ў напрамку фармальнай ускладненасці, пошукаў паэтамі новых спосабаў мастацкага самавыяўлення, а з іншага – у напрамку выразнай апоры на класічныя ўзоры сусветнай літаратуры.

У залежнасці ад мэты напісання вылучаюцца акрасанеты-прысвячэнні і акрасанеты-прызнанні (у інтымнай лірыцы). Сучасным беларускім паэтам належаць узоры разняволеных і класічных акрасанетаў з французскай, італьянскай і англійскай рыфмаграмай. Схільнасць паэтаў аб’яднаць форму акраверша з санетнай формай сведчыць пра дастаткова высокі ўзровень паэтычнага майстэрства творцаў і дасканалага і тонкага адчування нацыянальнай мовы.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Акулін, Э. Пяшчота ліўня : вершы, паэма / Э. Акулін. – Мінск : Выд-ва ЦК КПБ, 1990. – 30 с.
2. Барадулін, Р. Вечалле / Р. Барадулін. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 95 с.
3. Барадулін, Р. У неба пехатою. Апошнія вершы / Р. Барадулін ; прадм. У. Някляева ; паслясл., уклад. С. Шапрана. – Мінск : МЕДЫЯЛ, 2014. – 224 с.
4. Баркоўская, Т. Сучасны беларускі акраверш / Т. Баркоўская // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Мінск, 12–14 кастр. 1999 г. : у 2 ч. – Мінск : БДУ, 2000. – Ч. 1.
5. Бельскі, А. Сучасная беларуская літаратура. Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцяў (80–90-я гг.) : вучэб.-метад. дапамож. для настаўнікаў / А. Бельскі. – Мінск : Нар. асвета, 1997. – 254 с.
6. Бехер, И. Р. Философия сонета, или Маленькое наставление по сонету / И. Р. Бехер // Вопр. лит. – 1965. – № 10. – С. 190–208.
7. Бирюков, С. Року укор. Поэтические начала / С. Бирюков. – М. : Рос. гос. гуманитар. ун-т, 2003. – 512 с.

8. Жыбуль, В. Тыпалягічныя асаблівасьці беларускага акравершу [Электронны рэсурс] / В. Жыбуль. – Рэжым доступу: http://old.belcollegium.org/lekcyji/litaratura/zhybul07.htm.

9. Клепікаў, І. АКраСАНЕт [Электронны рэсурс] / І. Клепікаў. – Рэжым доступу: http://samlib.siwatcher.ru/k/klepikau_i/by_2002-03-22_1045.shtml.

10. Лагвіновіч, І. Ляда юдолі : вершы / І. Лагвіновіч. – Баранавічы : Творчае згуртаванне «Святліца», 2003 – 76 с.

11. Рагойша, В. Акраверш / В. Рагойша // Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – С. 439–441.

REFERENCES

1. Akulin, E. Piashchota liunia : viershy, paema / E. Akulin. – Minsk : Vyd-va CK KPB, 1990. – 30 s.

2. Baradulin, R. Viechallie / R. Baradulin. – Minsk : Mast. lit., 1980. – 95 s.

3. Baradulin, R. U nieba piechatoju. Aposhnija viershy / R. Baradulin ; pradm. U. Niakliajeva ; pasliasl., uklad. S. Shaprana. – Minsk : MIEDYJAL, 2014. – 224 s.

4. Barkouskaja, T. Suchasny bielaruski akraviersh / T. Barkouskaja // Slavianskija litaratury u kantekscie susvietnaj : materyjaly IV Mizhnar. navuk. kanf., Minsk, 12–14 kastr. 1999 h. : u 2-kh ch. – Minsk : BDU, 2000. – Ch. 1.

5. Biel’ski, A. Suchasnaja bielaruskaja litaratura. Stanauliennie i razviccio tvorchych indyvidual’nasciau (80-90-ja hh.) : vucheb.-mietad. dapamozh. dlia nastaunikau / A. Biel’ski. – Minsk : Nar. asvieta, 1997. – 254 s.

6. Biehier, I. R. Filosofija sonieta, ili Malien’koje nastavlienije po sonietu / I. R. Biehier // Vopr. lit. – 1965. – № 10. – S. 190–208.

7. Biriukov, S. Roku ukor. Poetichieskije nachchala / S. Biriukov. – M. : Ros. gos. humanitar. un-t, 2003. – 512 s.

8. Zhybul’, V. Typalahichnyja asablivasci bielaruskaha akraviershu [Eliektronny resurs] / V. Zhybul’. – Rezhym dostupu : http://old.belcollegium.org/lekcyji/litaratura/zhybul07.htm.

9. Kliepikau, I. AKraSANIEt [Eliektronny resurs] / I. Kliepikau. – Rezhym dostupu : http://samlib.siwatcher.ru/k/klepikau_i/by_2002-03-22_1045.shtml.

10. Lahvinovich, I. Liada judoli : viershy / I. Lahvinovich. – Baranavichy : Tvorchaje zhurtavannie «Sviatlica», 2003 – 76 s.

11. Rahojsha, V. Akraviersh // V. Rahojsha // Paetychny slounik / V. Rahojsha. – Minsk : Bielarus. navuka, 2004. – S. 439–441.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 07.04.2021*